# БЕЛАРУСКАЯ МОВА НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ: ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ (НА ВЫСНОВЕ МЕРКАВАННЯЎ ЗАМЕЖНЫХ СТУДЭНТАЎ)

**Шабанава Юлія Дзмітрыеўна, Рэспубліка Беларусь**
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, Мінск*
*Навуковы кансультант – м.ф.н. старшы выкладчык Носік А.А.*

Анатацыя. Артыкул асвятляе пытанні, якія закранаюць адносіны беларусаў да іх роднай мовы, а таксама дэманструе, якой бачаць яе замежныя госці. Галоўнае пытанне: ці зможа беларуская мова ў нашай краіне пераадолець рускую?
*Ключавыя словы*: *моўная сітуацыя, беларуская мова, перспектывы развіцця.*

Сучасная моўная сітуацыя ў Беларусі адрозніваецца сваёй складанасцю і неаднастайнасцю. Суадносіны дзвюх асноўных моў краіны – рускай і беларускай – мяняюцца ў залежнасці ад многіх фактараў. Але ж галоўным пытаннем з’яўляецца: на якой мове гавораць у Беларусі?

На такое, здавалася б, лёгкае пытанне беларусы вельмі сумняваюцца даваць разважлівы адказ. Яны самі для сябе не могуць вырашыць, на якой мове ім будзе зручней размаўляць.

У пачатку 1989 года быў праведзены апошні агульнасаюзны перапіс насельніцтва. Вынікам якога было: 65,6% насельніцтва Беларусі лічылі беларускую мову сваёй роднай мовай, а 12% сцвярджалі, што яны свабодна ёю валодаюць. Але ў той час людзі не разумелі, у якім сэнсе выкарыстоўвалася гэтая «родная мова».

З 1973 года «роднай мовай» лічылі тую мову, якой лепш валодала і на якой звычайна размаўляла насельніцтва. А ў апошнія гады яе трактавалі як частку этнічнай самасвядомасці і рэгістравалі па прынцыпе самавызначэння. У выніку даныя савецкага перапісу аб роднай мове адлюстроўваюць сітуацыю больш з этнапсіхалагічнага боку, чым з лінгвафункцыянальнага. А калі і адлюстроўваюць некаторае рэальнае размеркаванне моў, то, хутчэй, тое, якое існавала некалькі пакаленняў таму, але не цяперашняе.

Даследванні, праведзеныя ў 1993 годзе, паказалі, што людзей не цалкам задавальняла існаванне становішча з адзінай дзяржаўнай мовай, нягледзячы на тое, што ў пачатку ўсе марылі аб тым, каб ўсім разам размаўляць па-беларуску, каб дзеці хадзілі ў беларускія школы, каб беларуская мова стала поўнафункцыянальнай мовай, якой і павінна быць афіцыйная мова дзяржавы, а руская мова адышла б на другі план [1, с. 213]. Так, праведзенае па ўсёй тэрыторыі рэспублікі апытанне паказала, што 60,2% рэспандэнтаў жадаюць, каб дзяржаўнымі мовамі былі і беларуская і руская, і ўсяго толькі 22,7% – толькі беларуская мова. Гэтыя даныя былі апублікаваны ў газеце «Савецкая Беларусь» (07.07.1993). А потым у 1995 годзе быў праведзены ўсенародны рэферэндум, на якім на пытанне «Ці згодны Вы з наданнем рускай мове роўнага статусу з



Репозиторий БГМУ

беларускай ?»,83,3% людзей, якія прынялі удзел у галасаванні, адказалі»так» і толькі 12,7%-»не».

Калі разглядаць сучасны перыяд існавання беларускай мовы, то па даных Нацыянальнага статыстычнага камітэта Беларусі за 2013 г. на беларускай мове ў школах рэспублікі навучаецца 16,4%, у садках – 11,4%, ва ўстановах сярэдняй адукацыі – 0,9%, а ў ВНУ – усяго 0,2%. Па гэтым можна ўбачыць, наколькі менш людзей стала карыстацца беларускай мовай.

А што ж думаюць замежныя студэнты наконт існавання беларускай мовы і рускай мовы як дзвюх дзяржаўных моў? Для адказу на пастаўленае пытанне было праведзена даследаванне сярод замежных грамадзян, якія навучаюцца ў Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце.

| Пытанне | Адказ |
|---|---|
| 1) Ці лічыце лі вы,што беларуская мова павінна пераважаць над рускай мовай ў Беларусі? | |
| 2) Як вы ставіцеся да беларускай мовы? | |
| 3) Ці ведаеце вы якіх-небудзь знакамітых дзеячаў Беларусі? | |

Вынікі першага і другога пытання: 66,67% замежных рэспандэнтаў лічаць, што беларуская мова павінна пераважаць над рускай мовай ў Беларусі і 33,33% не згодны з гэтым сцвярджэннем.

Але ж усё-такі хочацца адзначыць некалькі адказаў, у якіх удзельнікі апытання не згодны з тым, каб беларуская мова пераважала над рускай. Яны аргументуюць гэта тым, што мовы вельмы сугучныя, і яны не чуюць ніякіх адрозняннеў паміж імі. А таксама другое выказванне, што мова з’яўляецца сумессю розных моў Еўропы і не мае сваёй асаблівасці.

Вынікі трэцяга пытання: толькі 16,67% ведаюць некаторых знакамітых дзеячаў Беларусі, напрыклад, Я.Купалу і Я.Коласа. Але існавала і існуе шмат дзеячаў Беларусі, якія трапілі ў іншыя краіны, былі і з’яўляюцца вядомымі ва ўсім свеце, але, на жаль, замежныя не ведаюць, што гэтыя знакамітыя людзі нарадзіліся ў Беларусі. Напрыклад, М.Шагал, М.Дуглас, С.Балмэр і многія іншыя.

Такім чынам, праведзенае сацапытанне дэманструе, што, з аднаго боку, беларусы больш за ўсё карыстаюцца ў маўленні рускай мовай. А гэта падштурхоўвае некаторых замежных, якія атрымліваюць адукацыю ў нашай краіне і пражываюць тут даволі працяглы час думаць, што беларуская мова зусім хутка знікне. Яе нават ЮНЕСКА класіфікуе як мову, якая знаходзіцца пад пагрозай знікнення (bedrohte sprache)). Але нельга забываць тое, што сучаснае пакаленне стала больш цікавіцца сваёй роднай мовай і пачало ўносіць бачныя ўклады ў яе развіццё, каб яна прадоўжыла сваё існаванне ў новым святле. Напрыклад, у 2003 годзе быў устаноўлены помнік ў гонар чыста беларускай літары «ў» у Полацку. Мова набывае новае гучанне ў сучаснай літаратуры,

сцэнічным мастацтве, песнях. Гэта відаць па колькасці тэатральных пастаноў, па маладых выканаўцах, якія імкнуцца ствараць сучасную культуру на роднай мове і прадстаўляюць яе не толькі ў сваёй краіне, але і за мяжой.

### Літаратура

1. Конюшкевич, М.И. Языковая ситуация в Белоруссии и особенности функционирования русского и белорусского языков // Язык в контексте общественного развития / Под ред. В.М. Солнцева, В.Ю. Михальченко. – М.: Институт языкознания РАН, 1994.

## BELARUSIAN LANGUAGE AT THE PRESENT STAGE: PROSPECTS OF DEVELOPMENT (BASED ON THE OPINIONS OF FOREIGN STUDENTS)

**Shabanova Julia Dmitrievna, Belarus**
*Belarusian state medical University,*
*Berarus, Minsk*
*Scientific supervisor – M. F. N. senior lecturer Nosik A. A.*

Abstract. Coverage of issues affecting the attitude of Belarusians to their native language and which foreign guests see it.Whether the Belarusian language is to overcome the Russian language?
*Keywords*: *language situation, the Belarusian language, development prospects.*

Репозиторий БГМУ